# Раздзел I. РОЛЯ І. А. ЮХО Ў РАЗВІЦЦІ ГІСТОРЫКА-ПРАВАВОЙ НАВУКІ

## ГІСТОРЫКА-ПРАВАВАЯ НАВУКА БЕЛАРУСІ І ЎКЛАД У ЯЕ РАЗВІЦЦЁ ПРАФЕСАРА І. А. ЮХО

**Т. І. Доўнар**

Мінулае з'яўляецца неад'емным багаццем народа, абавязковым фактарам нацыянальнай адметнасці. Юрыдычная навука, маючы галоўнай мэтай удасканаленне існуючых грамадскіх адносін, заўсёды займалася і асэнсаваннем папярэдніх набыткаў у сферы прававой культуры. Вытокі айчыннай юрыдычнай навукі, якая, як ніякая іншая галіна навуковага пазнання, арганічна звязана з дзяржаўнай арганізацыяй грамадства, знаходзяцца ў далёкай старажытнасці, калі з узнікненнем дзяржаў і пісьменства на тэрыторыі Беларусі з'явілася і патрэба ў асобнай групе людзей – захавальнікаў і тлумачальнікаў звычаяў. Таксама старажытныя мысліцелі Беларусі, аб якіх мы, на жаль, ведаем мала, займаліся асэнсаваннем папярэдніх прававых набыткаў.

Беларуская мінуўшчына ведае значную колькасць славутых гістарычных постацей – дзяржаўных дзеячоў, асветнікаў і мысліцеляў. Зоркай першай велічыні зззяе з глыбінь стагоддзяў імя Ефрасінні Полацкай, адносна якой навукоўцы даволі дакладна сцвярджалі, што Ефрасіння была добра знаёма з вучэннямі Сакрата, Платона, Арыстоцеля і іншых старажытных мысліцеляў, а таксама з творамі знакамітага візантыйскага святара і прапаведніка Іаана Златавуста [1, с. 160–161]. Яна актыўна займалася асветніцкай дзейнасцю, перапісвала і перакладала кнігі, выказвала ўласныя погляды на сутнасць чалавечага і дзяржаўнага жыцця, разважала аб прыродзе свецкай і боскай улады («градзе зямным і градзе нябесным»). Яе асуджэнне братазабойчых войнаў паміж удзельнымі княствамі, думкі аб неабходнасці паразумення паміж князямі і іх мірным суіснаванні шмат у чым пераклікаюцца са «Словам аб палку Ігаравым». Адпаведна яе светапогляду пры манастырах стваралюцца школы, дзе моладзь навучалася чытанню і пісьму, вывучала не толькі асновы хрысціянскай рэлігіі, але і нотную грамату, а таксама розныя навукі (гісторыю, медыцыну, замежныя мовы і інш.). Шмат увагі ў іх надавалася гістарычным ведам, прычым вывучалася не толькі гісторыя Полацкай зямлі і дынастыі Рагвалодавічаў, але ўся еўрапейская і нават сусветная гісторыя. Галоўнай жа мэтай вывучэння гісторыі выступала задача пашырэнне ідэі хрысціянскага мірнага суіснавання людзей, народаў і дзяржаў.

Усім сваім укладам жыцця, шматграннай дзейнасцю Ефрасіння паказвала каштоўнасць чалавечага жыцця, неабходнасць хрысціянскіх добразычлівых адносін паміж людзьмі і ўмацавання Праваслаўя як надзейнага сродку павышэння свядомасці і культуры народа. Яна была паслядоўнай прыхільніцай ідэі народнай асветы і менавіта ў адукацыі, у пашырэнні хрысціянскай ідэалогіі бачыла галоўны шлях да ўзвышэння Полацкага княства. Вучоныя сцвярджаюць, што дзейнасць і погляды Ефрасінні значна ўплывалі на палітычнае жыццё Полацкай дзяржавы, у тым ліку на рашэнні веча аб выгнанні і запрашэнні князёў і царкоўных іерархаў. Сярод простага народа Ефрасіння была добра вядома і як надзейны дарадчык у розных жыццёвых справах, найлепшы міратворца і справядлівы суддзя. Да яе часта звярталіся людзі з просьбай рассудзіць іх, і яна, кіруючыся «звычаямі Полацкай зямлі і Боскай справядлівасцю», паспяхова вырашала шматлікія спрэчкі. Вобраз Ефрасінні як самага справядлівага суддзі пашыраўся ў народзе. Усё жыццё Ефрасінні Полацкай, яе рэлігійная і грамадская дзейнасць на працягу стагоддзяў служылі прыкладам служэння свайму народу, узорам належнага маральнага жыцця сапраўднага хрысціяніна і грамадзяніна ўласнай дзяржавы. Пастулова яе вобраз набыў вышэйшую якасць нацыянальнага сімвалу, самаадданага служэння высакародным ідэалам, адданасці сваёй справе і вернасці Айчыне.

Пазней, калі старажытныя беларускія землі сталі палітыка-эканамічным цэнтрам буйной феадальнай дзяржавы – ВКЛ, узнікае больш настойлівая патрэба ў тэарэтычным асэнсаванні грамадскіх працэсаў і з'яў, павялічваецца цікавасць да ўласнай гісторыі. У гэты перыяд наглядаецца тэндэнцыя фарміравання кола мысліцеляў і палітычных дзеячоў (Францыск Скарына, Міхалан Літвін, Сымон Будны, Андрэй Волан, Мікалай Радзівіл Чорны, Астафій Валовіч, Леў Сапега і інш.), якія на падставе сусветных навуковых напрацовак пачынаюць даследаваць праблемы дзяржавы і права, уносяць практычныя прапановы па ўдасканаленні грамадскіх адносін і заканадаўства [3, с. 14–25]. Самым знакамітым вучоным, які пачаў непасрэдна закранаць прававыя праблемы, быў Ф. Скарына, які сцвярджаў, што права ствараецца народам са «сваімі старэйшымі». Ён выказаў думкі аб народным суверэнітэце, справядлівасці і вяршынстве закона ў грамадскіх адносінах, сцвярджаў, што закон павінен быць «почтивый, справедливый, можный, потребный, пожиточный подле прирожения, подлуг обычаев земли, часу и месту пригожий, явный, не имея к собе закритости, не к пожитку единого человека, а к посполитому доброму написанный» [6, с. 337]. Ф. Скарына з'яўляўся, па сутнасці, першым беларускім мысліцелем, які падняў пытанне аб суадносінах права і закона, хоць пад паняццем права ў яго выступала сістэма раннехрысціянскіх нормаў, якія стваралі яго ідэал, – «прирожоное право» [12].

Увогуле палітыка-прававой думцы Беларусі XVI ст., якое многія навукоўцы лічаць залатым векам Беларусі, былі ўласцівы значныя дасягненні. Менавіта ў гэты перыяд пільная ўвага шматлікіх беларускіх мысліцеляў і асветнікаў была скіравана на праблемы нарматыўна-прававога ўладкавання дзяржаўнага жыцця, на пашырэнне ў грамадстве высокіх маральна-гуманістычных прынцыпаў. Несумненна, актывізацыя навуковай дзейнасці была выклікана практычнымі патрэбамі законатворчасці, што знайшло практычную рэалізацыю пры ўдасканаленні папярэдняга заканадаўства і стварэнні новых сістэматызаваных законаў, заснаваных на мясцовым праве і народных традыцыях – Статутаў ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг., якія былі напісаны на беларускай мове і змяшчалі нормы ўсіх галін тагачаснага права.

З увядзеннем у дзеянне першага Статута, адным з распрацоўшчыкаў якога, на думку І. А. Юхо, быў Ф. Скарына [11], неабходнасць тэарэтычнага асэнсавання вынікаў правапрымянення павялічваецца. Гэта знайшло адлюстраванне ў шматлікіх навуковых працах беларускіх мысліцелей, асветнікаў, правазнаўцаў, якія пачынаюць выказваць думкі аб павышэнні правасвядомасці народа, неабходнасці юрыдычнай адукацыі суддзяў і службовых асоб, павелічэнні колькасці і якасці навучальных устаноў, пашырэнні кнігадрукавання і інш. У XVI ст. на тэрыторыі Беларусі пачынаюць дзейнічаць вышэйшыя навучальныя установы: Полацкі і Віленскі іезуіцкія калегіумы, Святаянская школа грамадзянскага права ў Вільні, якая ў 1641 г. была пераўтворана ў юрыдычны факультэт, а таксама сярэднія навучальныя установы – Слуцкае кальвінісцкае вучылішча, арыянскія школы ў Іўі, Клецку, Койданаве, Любчы, Лоску, Нясвіжы, Навагрудку і інш.

Пашырэнне на Беларусі рэфармацыйных і ренесансных ідэй садзейнічала свецкай інтэрпрэтацыі палітыка-прававых інстытутаў, аб чым сведчаць кнігі А. Волана і А. Алізароўскага, Л. Зізанія, П. Скаргі, М. Сматрыцкага і іншых мысліцеляў. Напрыклад, у працах А. Волана («Пра палітычную або грамадзянскую свабоду» (Кракаў, 1572); «Прамова да сената…» (Кракаў, 1572); «Пра шчаслівае жыццё або Найвышэйшае чалавечае дабро» (Вільня, 1596); «Пра гасудара і ўласцівыя яму дабрачыннасці» (Гданьск, 1608) і інш.) гаворыцца аб імкненні да свабоды як важнейшай натуральнай уласцівасці чалавека і неабходнасці яе абароны з дапамогай права. На яго думку, само права павінна ўтрымліваць тры істотныя прынцыпы – справядлівасць, разумнасць і гарантаванасць (быць абаронцам) свабоды і роўнасці людзей.

Такія прадстаўнікі рэфармацыйнага руху на Беларусі, як П. Гезка, М. Чаховіц, С. Будны, В. Цяпінскі, ужо непасрэдна займаліся праблемамі сутнасці права і найбольш дасканалага прававога рэгулявання грамадскіх адносін. Так, С. Будны пісаў, што ўсе службовыя асобы мусяць ведаць законы, яны павінны быць богабаязнымі, справядлівымі і сумленнымі, а

сам хрысціянскі манарх павінен кіравацца інтарэсамі дзяржавы і ўсіх абывацеляў [4, с. 15–16].

Пазней у XVIII ст. шмат зрабіла ў галіне адукацыі і навукі Адукацыйная камісія Рэчы Паспалітай (амаль што першае ў Еўропе міністэрства адукацыі), у склад якой уваходзілі такія знакамітыя вучоныя і палітычныя дзеячы, як І. Храптовіч, М. Пачабут, Г. Калантай, Я. Снядэцкі. Менавіта камісія правяла рэформу Віленскай акадэміі, якая з 1781 г. называлася Галоўнай школай ВКЛ, пераўтварыўшы яе з духоўнай ў свецкую ўстанову.

Пасля далучэння Беларусі да Расіі Галоўная школа ВКЛ у 1803 г. была рэарганізавана ва ўніверсітэт з 4 факультэтамі: маральных і палітычных навук, фізіка-матэматычным, медыцынскім, літаратурным і вольных мастацтваў. Выкладалі ў ім 34 прафесары і 12 ад'юнктаў (памочнікаў прафесараў), якія ў сваіх лекцыях і навуковых працах закраналі гістарычныя і гісторыка-прававыя праблемы, звязаныя з мінулым беларускага народа. Аб гэтым сведчаць кнігі І. Анацэвіча, М. Баброўскага, І. Даніловіча, І. Лялевеля, Т. Чацкага, Ю. Ярашэвіча і інш. У апошнія гады існавання з 47 прафесараў 36 былі ўраджэнцамі Беларусі і Літвы. У сувязі з тым, што ўніверсітэт стаў калыскай арганізатараў і ўдзельнікаў паўстання 1830–1831 гг., ён быў зачынены у 1832 г. [7, с. 288]. Таксама зачыняецца ў 1820 г. і Полацкая акадэмія, створаная ў 1812 г. на базе Полацкага езуіцкага калегіума, а частка студэнтаў была пераведзена у Пецярбургскі ўніверсітэт.

Навукоўцы ў гэты час робяць захады па адшукванні і захаванні мінулай дакументальна-прававой спадчыны, у сувязі з чым утвараецца некалькі навуковых цэнтраў (у Пецярбурзе, Вільні, Кіеве), якія займаюцца пошукам, аналізам і апублікаваннем шматлікага дакументальна-прававога матэрыялу – фундаментальнай крыніцазнаўчай базы для вывучэння гісторыі права Беларусі. Так, былі выдадзены «Беларускі архіў старажытных грамат» пад рэдакцыяй І. І. Грыгаровіча (ч. 1, 1824); «Зборнік Муханава» (1836 г.); «Акты, якія адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі», т. 1–5 (1846–1853 гг.); «Акты, выдаваемыя Віленскаю археаграфічнаю камісіяю», т. 1–39 (1865–1915 гг.), «Гісторыка-юрыдычныя матэрыялы...», т. 1–32 (Віцебск, 1871–1906 гг.); «Русская историческая библиотека», т. 1–39 (1872–1927 гг.) і інш. Павялічваецца як значэнне юрыдычнай навукі, так і неабходнасць асэнсавання мінулых тэарэтыка-прававых набыткаў. У гэты час пытанні гісторыі дзяржавы і права Беларусі, Літвы, Украіны закраналіся ў працах шматлікіх вучоных: А. Каравіцкага, Ю. Ярашэвіча, М. Кастамарава, М. Уладзімірскага-Буданава, М. Дашкевіча, М. Доўнар-Запольскага, Р. Дземчанкі, М. Каяловіча, І. Лапо, Ф. Леантовіча, М. Любаўскага, М. Максімейкі, І. Маліноўскага, Т. Чацкага, М. Ясінскага, Т. Нарбута і інш. Зразумела, што шматлікія фактары, а не толькі навуковыя пазіцыі гэтых вучоных, уплывалі на адносіны да гісторыі Беларусі. У сувязі з гэтым адбываецца актыўнае развіццё гісторыка-прававой навукі, усё больш павялічваецца цікавасць да

гісторыі Беларусі. Асаблівая заслуга ў гэтай справе належыць І. Даніловічу, які ў верасні 1814 г. пачаў выкладаць у Віленскім універсітэце мясцовае (г. зн. беларуска-літоўскае) права. Ён выявіў і апублікаваў шэраг помнікаў права Беларусі. Так, у 1826 г. апублікаваў тэкст Судзебніка 1468 г., падрыхтаваў да друку Статут ВКЛ 1529 г., а таксама збор дакументаў «Скарбніца актаў» (Скарбец дипломатов. Вильна, 1860–1862 гг.), у якім змешчаны вытрымкі ці апісанне 2383 актаў па гісторыі дзяржавы і права Беларусі і Літвы.

У гэты перыяд некаторыя вучоныя пачалі прысвячаць сваю творчасць непасрэдна гісторыі Беларусі (праца А. В. Турчыновіча «Агляд гісторыі Беларусі са старажытных часоў» (СПб, 1857), кніга М. А. Каяловіча «Лекцыі па гісторыі Заходняй Расіі» (СПб, 1884), шэраг артыкулаў і зборнікаў А. П. Сапунова і інш.).

З канца XIX ст. актывізаваліся даследаванні гісторыі права ВКЛ у Польшчы. Пераважная колькасць польскіх вучоных разглядалі яго як частку ўласнай гісторыі (Ю. Вольф, А. Галецкі, А. Лявіцкі, В. Камянецкі і інш.). Аднак некаторыя з іх лічылі ВКЛ самастойнай дзяржавай з уласным правам (С. Кутшэба, Я. Адамус і інш.).

У пачатку XX ст. у рэчышчы ўсплеску нацыянальна-вызваленчага руху праблема нацыянальнай дзяржаўнасці аказалася ў фокусе палітычнай барацьбы ў Беларусі. У сувязі з гэтым з'яўляецца шэраг кніг і навуковых артыкулаў, прысвечаных непасрэдна гісторыі беларускага народа (М. В. Доўнар-Запольскі, Я. Ф. Карскі, М. А. Янчук і інш.). Асаблівай значнасцю і грамадскім рэзанансам вылучаліся публікацыі, прысвечаныя ідэі ўзнаўлення беларускай дзяржаўнасці, якія найбольш актывізаваліся пры практычнай рэалізацыі гэтай ідэі. Так, прафесар М. В. Доўнар-Запольскі ў невялічкай па памеры кнізе «Асновы дзяржаўнасці Беларусі», якая спецыяльна была перакладзена на шматлікія мовы і перададзена ў замежныя пасольствы і місіі, абгрунтоўваў два самых важных навуковых тэзісы: беларусы з далёкай старажытнасці мелі ўласную дзяржаўнасць і яны маюць гістарычнае права на яе ўзнаўленне [5].

Толькі з узнаўленнем беларускай дзяржаўнасці на пачатку XX ст. і адкрыццём у 1921 г. Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пачаўся значны і якасны этап у развіцці гістарычнай і гісторыка-прававой навукі Беларусі. Першы рэктар БДУ У. І. Пічэта выдаў шмат навуковых прац, прысвечаных сацыяльна-культурнай, эканамічнай і прававой гісторыі Беларусі. Вакол яго сфарміравалася кола даследчыкаў (А. В. Бурдзейка, В. Д. Дружчыц, Т. І. Забела, К. І. Толсталес і інш.), якія распрацоўвалі шматлікія пытанні гісторыі Беларусі, у тым ліку і гісторыка-прававыя. Напрыклад, В. Д. Дружчыц унёс значны ўклад у даследаванне пытанняў аб магдэбургскім праве ў гарадах Беларусі.

Таксама ў адчыненым у 1922 г. Інстытуце беларускай культуры разам з вывучэннем актуальных праблем дзяржаўна-прававога будаўніцтва на Беларусі (напрыклад, даследаваннем прычын злачыннасці) даследаваліся пытанні прававой гісторыі, у кантэксце якой пачалося выданне дзяржаўна-прававых актаў XVI–XVII стст., уваходзячых у склад Літоўскай метрыкі. Быў выдадзены трохтомны «Беларускі архіў» (1927–1930 гг.). Аднак у 1930-я гг. пачалася ідэалагічная кампанія барацьбы з т. зв. нацыянал-дэмакратызмам, наступствам чаго стала рэпрэсіраванне шэрага вучоных (У. І. Пічэта, Г. Е. Парэчын, Н. М. Гуткоўскі, В. Д. Дружчыц і інш.) і скарачэнне навуковых даследаванняў. Вялікія страты панесла прававая навука Беларусі і ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

Новы этап навуковых даследаванняў пачаўся ў пасляваенны перыяд з узнаўленнем дзейнасці Акадэміі навук БССР (1944 г.) і Мінскага юрыдычнага інстытута, які ў 1954 г. быў пераўтвораны ў юрыдычны факультэт БДУ. На гэтым этапе значна пасадзейнічаў развіццю навуковай дзейнасці працэс пашырэння правоў саюзных рэспублік, які пачаўся ў другой палове 50-х гг. XX ст. На падставе рашэнняў XX з'езда КПСС адносна пашырэння правоў рэспублік у сферы эканомікі і заканадаўства намаганнямі беларускіх вучоных-правазнаўцаў пачынаюцца істотныя зрухі ў сферы распрацоўкі айчыннай гісторыі. У рэспубліцы быў пакладзены пачатак новаму накірунку гісторыка-прававой навукі – гісторыі дзяржавы і права Беларускай ССР. Сапраўдным прарывам у гэтым накірунку стала выданне ў 1958 г. у БДУ калектыўнай працы «Очерки по истории государства и права БССР» (Б. Е. Бабіцкі, Ф. І. Гаўзе, І. І. Гарэлік, Г. А. Павецьеў, Л. А. Рудзіцкі, І. С. Цішкевіч, Ю. П. Смірноў, В. Ф. Чыгір), у якой з пазіцый тагачаснай савецкай гісторыка-прававой навукі разглядаліся пытанні развіцця дзяржавы і права БССР з моманту яе ўзнікнення да 1934 г. Друкуюцца таксама кнігі С. П. Маргунскага (напрыклад, «Государственное строительство БССР в годы восстановления народного хозяйства (Мінск, 1966) і іншых аўтараў. У 1969 г. таксама ў выдавецтве БДУ калектывам аўтараў (Б. Е. Бабіцкі, А. А. Галаўко, Ф. І. Гаўзе, І. І. Гарэлік, В. А. Дарогін і інш.) былі выдадзены «Очерки по истории государства и права БССР» (выпуск другі), дзе разглядаліся пытанні развіцця дзяржавы і права БССР з 1936 па 1968 г. Адказным рэдактарам і сааўтарам гэтай кнігі быў І. А. Юхо. У гэтае выданне былі ўключаны вынікі кандыдацкай дысертацыі І. А. Юхо аб праблеме ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у 1939 г. (другая глава). Увогуле пытанням уз'яднання Заходняй Беларусі з Беларускай ССР быў прысвечаны шэраг яго публікацый [17].

У 1970–1976 гг. былі надрукаваны два тамы акадэмічнага выдання «История государства и права Белорусской ССР», падрыхтаваныя калектывам акадэмічных і вузаўскіх навукоўцаў (С. П. Маргунскі, І. І. Пацяружа, В. М. Арцёмава, Ю. П. Броўка, М. В. Сторажаў, У. І. Семянкоў, У. І. Ша-

байлаў і інш.). Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы гэтых выданняў прыняў І. А. Юхо.

Патрэбна падкрэсліць, што з 1963 г. І. А. Юхо пачаў выкладаць на юрыдычным факультэце БДУ новую вучэбную дысцыпліну – гісторыю дзяржавы і права Беларусі. Амаль што з чыстага ліста ён распрацаваў адпаведны курс і вучэбную праграму па гэтым прадмеце, дзе вызначаліся мэты і задачы курса, пералік асноўных тэм і пытанняў, патрабаванні да студэнтаў і інш. [9]. Вынікам гэтага стала актывізацыя навуковых даследаванняў, у тым ліку студэнцкіх і аспіранцкіх, у сферы айчыннай прававой гісторыі.

У кантэксце выкладчыцкай дзейнасці ўвага І. А. Юхо надавалася не толькі падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў-правазнаўцаў, але і выхаванню нацыянальна-свядомых студэнтаў. У сваіх лекцыях ён выказваў і абгрунтоваў вельмі цікавыя і самастойныя думкі па праблемных пытаннях грамадска-палітычнага жыцця, тэорыі права, айчыннай гісторыі дзяржавы і права, прычым часам такія, што супярэчылі афіцыйным поглядам савецкай навукі. Менавіта гэта служыла падставай для асаблівай зацікаўленасці студэнтаў, аспірантаў, маладых навукоўцаў і заахвочвання іх да навуковых даследаванняў. Да таго ж І. А. Юхо, валодаючы ўнікальнай інфармацыяй і энцыклапедычнымі ведамі, не баяўся выйсці за межы выкладаемага прадмета. Так, асабістай яго зацікаўленасцю была творчая спадчына і грамадская дзейнасць вялікага рускага пісьменніка Льва Мікалаевіча Талстога, у сувязі з чым І. А. Юхо, не шкадуючы сіл і часу, у асяроддзі выкладчыкаў і студэнтаў, у любой аўдыторыі актыўна прапагандаваў творчасць Л. М. Талстога і яго неўміручую ідэю аб непраціўленні злу насіллем. Акрамя таго, І. А. Юхо надрукаваў вялікую колькасць артыкулаў, прысвечаных творчасці гэтага знакамітага пісьменніка [13].

У гэты перыяд І. А. Юхо прыкладае намаганні да актуалізацыі пытанняў гісторыі дзяржавы і права Беларусі, спрабуе заявіць аб асаблівасцях беларускай гісторыі [8], а таксама выдае шматлікія навуковыя артыкулы па праблемных пытаннях айчыннай гісторыі [10], у якіх асаблівую ўвагу звяртае на знакамітыя помнікі права Беларусі феадальнага перыяду – Статуты 1529, 1566, 1588 гг., якія называе зводамі законаў ВКЛ [11].

У выдадзенай у 1978 г. на падставе доктарскай дысертацыі манаграфіі «Прававое становішча насельніцтва Беларусі ў XVI ст.» ён характарызуе структуру феадальнага грамадства на тэрыторыі Беларусі, раскрывае прававы статус самага прывілеяванага саслоўя – шляхты, звяртае ўвагу на тое, што беларускія сяляне мелі пэўныя правы, а не толькі значную колькасць абавязкаў, гаворыць аб становішчы гарадскога насельніцтва, асабліва тых гарадоў, якія мелі магдэбургскае права, акцэнтуе ўвагу на тым, што з XIV ст. беларускія гарады пачалі атрымліваць права на

самакіраванне, на падставе чаго палітычна і эканамічна развіваліся не толькі гарады, але і сама дзяржаўнасць.

Патрэбна адзначыць, што на ўсіх этапах развіцця гісторыка-прававой навукі Беларусі ёй былі ўласцівы шматлікія праблемы, многія з якіх застаюцца актуальнымі і зараз. У дарэвалюцыйны і савецкі перыяды даследаванне прававой спадчыны, якое з'яўляецца важнейшай задачай гісторыка-прававой навукі, стрымлівалася шэрагам фактараў. Амаль не перадрукоўваўся шматлікі гістарычны дакументальна-прававы матэрыял, далёка не ўсе архіўныя матэрыялы былі даступнымі даследчыкам. Гістарычныя падзеі трактаваліся часам адвольна і тэндэнцыйна, шмат пытанняў асвятлялася павярхоўна і аднабакова, а некаторыя з іх увогуле замоўчваліся. Нават зараз у некаторых замежных выданнях, у тым ліку ў расійскіх падручніках па гісторыі дзяржавы і права, утрымліваюцца скажоныя звесткі пра Беларусь. Існуе і праблема непаразумення з некаторымі літоўскімі даследчыкамі, якія на падставе назвы («Вялікае княства Літоўскае», «Літва») і іншых абставін схільны прыпісваць сабе гісторыю гэтай дзяржавы. У гэтым ім «дапамагаюць» кнігі замежных гісторыкаў права, якія апошняе дзесяцігоддзе актыўна перавыдаюцца ў нас (напрыклад, Аннерс Э. История европейского права. М., 1994) і ў якіх гаворыцца аб гісторыі так званага «літоўскага» права, або аб «Літоўскіх Статутах», што ніяк не атаясамляецца з гісторыяй Беларусі.

У сувязі з гэтым існавалі шматлікія прабелы ў гісторыі дзяржавы і права Беларусі (асабліва гэта тычыцца пытанняў развіцця прававой навукі, гісторыі заканадаўства і парламентарызму, эвалюцыі асобных інстытутаў і галін права і інш.), шэраг з якіх застаецца да гэтага часу. Становішча ўскладняецца тым, што ў іншых краінах (асабліва ў суседніх, чыя гісторыя непасрэдна звязана з гісторыяй Беларусі) даследаванні праводзіліся больш актыўна, і гэты працэс ў апошнія дзесяцігоддзі вельмі актывізаваўся, аб чым сведчаць навуковыя публікацыі і абароненыя дысертацыі.

Новыя прагрэсіўныя тэндэнцыі ў развіцці дзяржаўнасці Беларусі на пачатку 90-х гг. XX ст. мелі вынікам актывізацыю навуковых даследаванняў і арыентацыю даследчыкаў на праўдзівы і плюралістычны падыход да асвятлення гістарычных працэсаў. У гісторыка-прававой навуцы на змену дагматызму прыйшоў крытычны падыход да створаных міфаў, ідэалагізмаў і схемаў. Галоўнай падставай актыўнай распрацоўкі айчыннай гісторыі стала заканадаўчае замацаванне ў дзеючай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь факта шматвяковага існавання беларускага этнасу і беларускай дзяржаўнасці як суб'ектаў сусветнай гісторыі. У гэты перыяд, калі Беларусь стала на шлях пабудовы суверэннай прававой дзяржавы, стаў вельмі актуальным нацыянальна-дзяржаўны падыход у вывучэнні гісторыі дзяржавы і права Беларусі, пры якім распрацоўка гісторыі ўласнага народа аб'яўлялася прыярытэтным накірункам навуковых даследаванняў. Усведамленне

характару свайго ўласнага гістарычнага шляху стала таксама ядром новай канцэпцыі ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці.

Беларускія вучоныя пачалі пераасэнсоўваць уласную гісторыю, паказваць ўласнае разуменне гістарычных падзей і працэсаў. Напрыклад, частку створаных у беларускай гісторыі міфаў развянчаў М. Ермаловіч. З'яўляецца шэраг прац гісторыкаў (А. Грыцкевіча, З. Капыскага і інш.), філосафаў (В. Конана, І. Падокшына і інш.) адносна праблемных пытанняў гісторыі Беларусі і запаўнення існуючых «белых плямаў», у якіх у кантэксце агульных гістарычных пытанняў закраналіся і гісторыка-прававыя праблемы. У навуковых публікацыях беларускіх гісторыкаў-правазнаўцаў (А. Вішнеўскага, Т. Доўнар, М. Сільчанкі, С. Сокала, В. Шалкапляс і інш.) і іншых беларускіх вучоных даследаваліся шматлікія пытанні прававой гісторыі.

Важнай падставай навукова-даследчай актывізацыі ў сферы гісторыка-прававой навукі сталі шматлікія артыкулы і кнігі прафесара І. А. Юхо, у якіх характарызавалася гістарычнае развіццё беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай прававой сістэмы, аналізаваліся праблемныя пытанні гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Так, І. А. Юхо не аднойчы звяртаў увагу на пытанне аб паходжанні беларускай дзяржаўнасці, якое дагэтуль застаецца адкрытым. Гэта абумоўлена шэрагам прычын, а асабліва недастатковасцю дайшоўшых да нашага часу пісьмовых крыніц, аналіз якіх дазволіў бы ўстанавіць сапраўдныя час і прычыны, што прывялі да пераходу ад дадзяржаўных формаў грамадскага існавання да палітыка-тэрытарыяльнай арганізацыі кіравання грамадствам. Вынікам гэтага стала шматлікасць тэорый і прычын паходжання дзяржаўнасці ва Усходняй Еўропе і часам вельмі суб'ектыўных меркаванняў адносна гістарычнага перыяду ўзнікнення дзяржаўнасці. І. А. Юхо, крытыкуючы нарманскую тэорыю і папярэднія навуковыя погляды, што доўгі час панавалі ў гістарычнай навуцы, сістэмна прааналізаваў творы навукоўцаў дарэвалюцыйнага і савецкага перыядаў (В. Тацішчава, І. Забеліна, М. Дзьяканава, В. Сергеевіча, С. У. Юшкова, Б. Д. Грэкава, Б. А. Рыбакова і інш.), у якіх у асноўным выказвалася думка, што дзяржаўнасць ва ўсходніх славян паўстала на пачатку новай эры і толькі часам некалькі завуаліравана выказвалася меркаванне аб магчымасці існавання дзяржаўнасці на стыку старой і новай эпох. Абагуліўшы літаратурныя крыніцы, летапісныя звесткі, І. А. Юхо зрабіў вывад, што дзяржаўнасць у народаў Усходняй Еўропы паўстала задоўга да новай эры. Ён падмацоўваў гэты вывад спасылкамі на Герадота, які засведчыў існаванне нашых продкаў – будзінаў і неўраў, што жылі на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў VI–V стст. да н. э., а таксама на меркаванні некаторых навукоўцаў.

І. А. Юхо даследаваў іншыя шматлікія пытанні гістарычнага развіцця беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай прававой сістэмы, у тым ліку ў

сферы гісторыі органаў улады, крыніц права, фарміравання галіновай структуры права, айчыннага канстытуцыяналізму, магдэбургскага права і г. д. і на падставе пераасэнсавання папярэдніх навуковых напрацовак выказваў па іх уласныя навуковыя пазіцыі. Адносна савецкага перыяду эвалюцыі беларускай дзяржаўнасці ён адзначаў, што, на жаль, развіццё Беларускай ССР адбывалася «не на аснове самастойнага гістарычнага развіцця беларускай нацыянальнай дзяржавы» [14, с. 3–4].

Асаблівая заслуга прафесара Юхо ў заснаванні навуковай гісторыка-прававой школы Беларусі. Пад яго кіраўніцтвам было абаронена шмат кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. З яго ўдзелам навукоўцы кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права БДУ распрацоўвалі разнастайныя пытанні айчыннай гісторыі, публікавалі манаграфіі, вучэбныя дапаможнікі па гісторыі дзяржавы і права Беларусі.

Увогуле І. А. Юхо ўнёс вялікі ўклад у развіццё беларускай гісторыка-прававой навукі. Ім было апублікавана звыш 200 навуковых прац, у тым ліку некалькі манаграфій і навучальных дапаможнікаў. Навуковыя працы І. А. Юхо былі прысвечаны самым розным і вельмі актуальным праблемам гісторыі дзяржавы і права Беларусі: паходжанню назвы «Беларусь», помнікам айчыннага права, прававому становішчу насельніцтва, уніям ВКЛ з Польшчай, уплыву Польшчы і Расіі на гісторыю беларускага народа, гісторыі заканадаўства, прававым поглядам беларускіх мысліцеляў, значэнню гісторыка-прававой навукі і інш. Так, ім упершыню была выказана думка аб непасрэдным удзеле вялікага беларускага гуманіста і мысліцеля Ф. Скарыны ў падрыхтоўцы знакамітага звода законаў – Статута ВКЛ 1529 г. Ён выказаў уласныя пазіцыі па праблеме фарміравання тэрыторыі Беларусі, абгрунтаваў тэзіс аб значна больш старажытным паходжанні беларускай дзяржаўнасці, чым было афіцыйна вызначана ў савецкай гістарычнай навуцы, аб пераважна беларускім этнічным характары ВКЛ, сутнасці паланізацыйнай палітыкі кіраўніцтва Рэчы Паспалітай, прычым адзначаў, што гэта дзяржава з'яўлялася канфедэрацыяй, у якой захоўваўся суверэнітэт ВКЛ і інш. Значная ўвага надавалася ім перыяду знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі, сутнасці і наступствам русіфікатарскай палітыкі царызму. Ён падрэсліваў добра вядомы навукоўцам гістарычны факт, што беларускія землі да падзелаў Рэчы Паспалітай у канцы XVIII ст. не ўваходзілі ў склад Расіі.

У сваіх творах І. А. Юхо звяртаў увагу на айчынныя прававыя набыткі, значнасць і прагрэсіўнасць поглядаў шматлікіх беларускіх мысліцеляў, дзяржаўных дзеячоў мінулага перыяду. Так, некалькі навуковых прац ён прысвяціў выдатнаму дзеячу нацыянальна-вызваленчага руху XVIII ст. Тадэвушу Касцюшку, які пакінуў значны след у палітычным жыцці не толькі шэрагу еўрапейскіх дзяржаў, але і ў Злучаных Штатаў Амерыкі, дзе

змагаўся за яе незалежнасць [15]. Несумненнай заслугай І. А. Юхо з'яўляецца ўвядзенне ў навуковы абарот гісторыка-прававой навукі звестак аб творчасці амаль што забытых на працягу пэўнага перыяду часу айчынных мысліцеляў і дзяржаўных дзеячоў (Ф. Скарыны, М. Літвіна, А. Волана, Мікалая Радзівіла Чорнага, А. Валовіча, Л. Сапегі, С. Буднага, П. Скаргі, М. Сматрыцкага і інш.). Пры гэтым ён падкрэсліваў генетычную сувязь палітыка-прававой думкі і заканадаўства.

Менавіта гісторыі заканадаўства І. А. Юхо надаваў значную ўвагу. Так, кніга «Крыніцы беларуска-літоўскага права» (Мінск, 1991) была прысвечана характарыстыцы важнейшых нарматыўных актаў, якія дзейнічалі на працягу стагоддзяў у Беларусі: агульназемскіх, абласных, валасных, гарадскіх грамат, Судзебніка 1468 г., Статутаў 1529, 1566, 1588 гг. і інш. На падставе сістэмнага аналізу помнікаў права ён зрабіў вывад аб нацыянальнай адметнасці беларускага права і параўнальна высокай тагачаснай прававой культуры беларускага народа, аб чым сведчыць заканадаўства XV–XVI стст. і асабліва Статут 1588 г.

Важнай навуковай падзеяй стала выданне манаграфіі І. А. Юхо «Гістарыяграфія гісторыі дзяржавы і права феадальнай Беларусі» (Мінск, 1999), дзе быў дадзены кароткі агляд навуковых публікацый, у якіх разглядаліся або закраналіся, пытанні гісторыі дзяржавы і права Беларусі, а таксама іх крытычная ацэнка. Асабліва ён падвергаў крытыцы погляды польскіх навукоўцаў адносна несамастойнасці Беларусі і значнага уплыву польскага права, а таксама адзначаў памылковасць іх поглядаў адносна ўній ВКЛ з Польшчай. Увогуле вучоны звяртаў увагу на прычыны тэндэнцыйных адносін шматлікіх замежных навукоўцаў (польскіх, літоўскіх, расійскіх і інш.) да беларускай гісторыі, у сувязі з чым і ўзнікалі «белыя плямы», замоўчванне праблемных пытанняў і нават фальсіфікацыя гісторыка-прававой навукі Беларусі.

І. А. Юхо прымаў удзел у падрыхтоўцы шэрагу энцыклапедычных выданняў, у тым ліку быў адным з ініцыятараў і аўтараў першага на беларускай мове выдання «Юрыдычнага энцыклапедычнага слоўніка» (Мінск, 1989), сааўтарам і перакладчыкам энцыклапедычнага выдання «Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарый» (Мінск, 1989). Менавіта па ініцыятыве І. А. Юхо быў перавыдадзены шэраг помнікаў права Беларусі, у тым ліку Статут 1588 (1989 г.) і Статут 1566 гг. (2003 г.), што садзейнічала актывізацыі навуковых даследаванняў. Ён таксама удзельнічаў ў падрыхтоўцы выданняў: «Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыклапедычны даведнік» (Мінск, 1995), «Асветнікі зямлі беларускай» (Мінск, 2003), «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі»: у 6 т. (1993–2004 гг.), «Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя»: у 2 т. (2005–2006 гг.).

Некалькі артыкулаў І. А. Юхо прысвяціў развіццю юрыдычнай навукі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, гісторыі грамадзянска-працэсуаль-

нага права і інш. [16]. Акрамя таго, ён прыняў удзел у выданні на англійскай мове кніг аб гістарычным шляху беларускай нацыі і дзяржавы [2].

Шэраг кніг Я. А. Юхо («Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі» (Мінск, 1992), «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» (Мінск, 2000) і інш.), у якіх разглядаецца ў агульных рысах паэтапная гісторыя развіцця дзяржаўнасці Беларусі і выказваюцца ўласныя погляды на айчынную прававую гісторыю, былі непасрэдна прызначаны студэнтам юрыдычных вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. Гэтыя кнігі і зараз з'яўляюцца важнейшымі навучальнымі дапаможнікамі для студэнтаў-правазнаўцаў ВНУ Рэспублікі Беларусь.

Увогуле патрэбна адзначыць, што ўся творчая спадчына доктара юрыдычных навук, прафесара І. А. Юхо і ў далейшым будзе садзейнічаць развіццю гісторыка-прававой навукі і служыць прыкладам навуковай аб'ектыўнасці і служэння Айчыне.

## Літаратура


1. Асветнікі зямлі беларускай: Энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск, 2001. – 496 с.

2. Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы = The history of the belarusan Nation and State / М. Біч, Р. Гарэцкі, У. Конан [і інш.]; рэдкал.: У. Арлоў [і інш.]; перакл. на англ. А. Бурсаў. – Мінск, 2005. – 440 с.; Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы = The history of the belarusan Nation and State / М. Біч, Р. Гарэцкі, У. Конан [і інш.]; рэдкал.: У. Арлоў [і інш.]; перакл. на англ. А. Бурсаў. – Мінск, 2006. – 440 с.

3. *Доўнар, Т. І.* Беларуская дзяржаўнасць: асноўныя этапы і праблемы гістарычнага развіцця / Т. І. Доўнар // Демократическое социальное правовое государство – основной вектор развития Республики Беларусь: материалы респ. науч.-практ. конф., посвященной 90-летию органов юстиции Республики Беларусь (Минск, 11 марта 2009 г.) / Мин-во юстиции Респ. Беларусь; под ред. Министра юстиции Респ. Беларусь, канд. юрид. наук, доцента В. Г. Голованова. – Минск: РУП «Издательство "Белорусский Дом печати"», 2009. – С. 14–25.

4. *Доўнар, Т. І.* Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI–XVIII ст.: Хрэстаматыя / аўт.-склад. Т. І. Доўнар, Ю. П. Доўнар, Л. Л. Голубева; пад рэд. Т. І. Доўнар. – Мінск, 2004. – 206 с.

5. *Доўнар-Запольскі, М. В.* Асновы дзяржаўнасці Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі. – Мінск, 1994. – 23 с.

6. Францыск Скарына і яго час: энцыкл. давед. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. сав. энцыкл., 1988. – 608 с.

7. *Шалькевіч, В. Ф.* Віленскі ўніверсітэт / В. Ф. Шалькевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 2. – Мінск: БелЭн, 1994. – С. 287–288.

8. *Юхо, И. А.* Общественно-политический строй и право Литовского государства (XIII–XVI вв.) / И. А. Юхо // История государства и права СССР: учебник для студентов юрид. вузов и фак.: в 2 ч. / Моск. гос. ун-т им. М. В. Ломоносова; К. А. Сафроненко (отв. ред.) [и др.]. – М., 1967. – Ч. 1. – С. 238–265 і інш.

9. *Юхо, И. А.* Программа по истории государства и права БССР / И. А. Юхо, Б. Е. Бабицкий. – Минск, 1964. – 17 с.

10. *Юхо, І. А.* З гісторыі права / І. А. Юхо // Беларусь. – 1966. – № 5. – С. 28; *Юхо, І.* Грамадскія і прававыя погляды Скарыны // Полымя. – 1967. – № 6. – С. 175–180; *Юхо, І. А.* Уладзімір Пічэта [Старонкі беларус. энцыкл.] / І. А. Юхо // Полымя. – 1967. – № 5. – С. 251–252; *Юхо, Я.* Беларусь у новай польскай энцыклапедыі / Я. Юхо // Полымя. – 1968. – № 4. – С. 177–180; *Юхо, Я.* Пра назву «Беларусь» / Я. Юхо // Полымя. – 1968. – № 1. – С. 175–182 і інш.

11. *Юхо, І. А.* Хто складаў Літоўскі Статут / І. А. Юхо // Беларусь. – 1958. – № 3. – С. 31; *Юхо, Я. А.* Статуты Вялікага княства Літоўскага / Я. А. Юхо // Полымя. – 1966. – № 11. – С. 125–137 і інш.

12. *Юхо, І.* Грамадскія і прававыя погляды Скарыны / І. Юхо // Полымя. – 1967. – № 6. – С. 175–180.

13. *Юхо, Я. А.* Будучыня належыць Льву Талстому / Я. А. Юхо // Res Nova. – 1997. – № 1. – С. 8–9; *Юхо, И. А.* Непротивление злу // Всемирная литература. – 1998. – № 1. – С. 153–161.

14. *Юхо, Я. А.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: дапаможнік: у 2 ч. / Я. А. Юхо. – Мінск, 2003. – Ч. 2. – 275 с.

15. *Юхо, Я. А.* За вольнасць нашу і вашу: Тадэвуш Касцюшка / Я. А. Юхо. – Мінск, 1990. – 52 с.; *Юхо, Я. А.* Крыніцы беларуска-літоўскага права / Я. А. Юхо; пад рэд. Т. Ф. Есіпенкі. – Мінск: Беларусь, 1991. – 238 с.; *Юхо, Я.* За вольнасць нашу і вашу [Тадэвуш Касцюшка]: урывак з нарыса / Я. Юхо // Бацькаўшчына: зб. гіст. літ.: для сярэд. і ст. шк. узросту / уклад., прадмова С. С. Панізніка. – Мінск, 1994. – С. 96–98; *Юхо, Я. А.* «Нарадзіўся я ліцьвінам...»: Тадэвуш Касцюшка / Я. А. Юхо, У. Емяльянчык. – Мінск, 1994. – 68 с.; *Юхо, Я. А.* Наш нацыянальны герой [Т. Касцюшка, 1745–1817] / Я. А. Юхо // Сыны і пасынкі Беларусі / С. В. Барыс, С. В. Тарасаў, Г. А. Ланеўскі [і інш.]; уклад. С. В. Барыс. – Мінск, 1996. – С. 95–134.

16. *Юхо, Я. А.* Развіццё юрыдычнай навукі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце [1926–1995 гг.] / Я. А. Юхо / Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3. Права. – 1969. – № 1. – С. 3–6; *Юхо, И. А.* Юридическая наука БССР за 60 лет / И. А. Юхо // Правоведение. – 1979. – № 1. – С. 3–10; *Юхо, И. А.* Основы гражданского судопроизводства Союза ССР и ГПК союзных республик / И. А. Юхо // Соц. законность. – 1962. – № 7. – С. 38–43; *Юхо, И. А.* Гражданский процессуальный кодекс Польской Народной республики // Советская юстиция. – 1967. – № 1. – С. 27–28.

17. *Юхо, Я. А.* Уз'яднанне беларускага народа ў адзінай Савецкай дзяржаве – завяршаючы этап тэрытарыяльнай кансалідацыі беларускай сацыялістычнай нацыі / Я. А. Юхо // Фарміраванне і развіццё беларускай сацыялістычнай нацыі / З. У. Доктараў [і інш.]; рэдкал.: П. Ф. Глебка [і інш.]; Акад. навук БССР, Ін-т філасофіі. – Мінск: АН БССР, 1958. – С. 129–143; *Юхо, Я.* Беларусь у новай польскай энцыклапедыі / Я. Юхо – 1968. – № 4. – С. 177–180; *Юхо, И. А.* Установление советской власти в западных областях Белоруссии и воссоединение белорусского народа в едином советском социалистическом государстве / И. А. Юхо // Очерки истории государства и права БССР / редкол.: Б. Е. Бабицкий [и др.]; И. А. Юхо (отв. ред.). – Минск: Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1969. – Вып. 2. – Гл. 2. – С. 71–97.